морт» (1990), серыі «Метамарфозы» (1992—93), «Балтыйскія асацыяцыі» (1993), тэматычныя карціны «І.Пуліхаў» (1978), «Абаронцы мірнага неба» (2005), «Дачыненне (аперацыя «Баграціён»)» (2011). *Ю.Ю.Захарына.*

**ЛО́ЙКА** Георгій Валянцінавіч (н. 28.8.1946, г. Ліхаслаўе Цвярской вобл., Расія), беларускі жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1971). З 1971 выкладаў у Бел. тэатр.-маст. ін-це, з 1987 у Мін-ве культуры Беларусі, з 1991 кіраўнік творчай майстэрні. З 2001 у Бел. пед. ун-це (з 2005 заг. кафедры). Адначасова ў 2009—12 гал. рэд. час. «Мастацкая адукацыя і культура». Працуе ў станковым жывапісе. Індывідуальны творчы почырк Л. адзначаецца свабоднай манерай пісьма, экспрэсіўнасцю. Сярод работ: пейзажы «Вішня квітнее» (1986), «Восень на Бярэзіне», «Вечар на Прыпяці», «Зімовая цішыня» (усе 1987), «На Любаншчыне», «Статак», (абедзве 1988), нацюрморты «Нацюрморт з рабінай» (1985), «Раніца» (1988), «Вясковы нацюр-

*Г.**Лойка**. Дачыненне (аперацыя «Баграціён»).*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ